ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 9 (604) | Субота, 23 сакавіка 1985 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ВЕРНАСЦЬ ЛЕНІНСКАМУ КУРСУ

Партыя, увесь савецкі народ з гарачым адабрэннем сустрэлі паведамленне аб аднадушным выбранні на нечарговым сакавіцкім Пленуме ЦК КПСС таварыша М. С. Гарбачова Генеральным сакратаром ЦК КПСС. У сваёй яркай, глыбокай і змястоўнай прамове на Пленуме тав. М. С. Гарбачоў пацвердзіў непарушнасць і пераемнасць ленінскага курсу нашай партыі ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі.

У прамове таварыша М. С. Гарбачова на Пленуме падкрэслена, што «стратэгічная лінія, выпрацаваная на XXVI з'ездзе КПСС, наступных Пленумах ЦК пры актыўным удзеле Ю. У. Андропава і К. У. Чарненкі, была і застаецца нязменнай. Гэта — лінія на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, на ўдасканальванне ўсіх бакоў жыцця грамадства». Гэта нязменная лінія ахоплівае пераўтварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы вытворчасці, удасканальванне сістэмы грамадскіх, перш за ўсё, эканамічных адносін і развіццё самога чалавека, якаснае паляпшэнне матэрыяльных умоў яго жыцця і працы, яго духоўнага аблічча. На Пленуме адзначалася, што ключавая задача эканамічнага развіцця краіны — дабіцца рашаючага павароту ў пераводзе народнай гаспадаркі на інтэнсіўны шлях развіцця.

Непарушнасць і пераемнасць курсу КПСС у галіне ўнутранай палітыкі выражаецца і ў мэтавай накіраванасці сацыялістычнай эканомікі. «Усё ў імя чалавека, для шчасця чалавека — гэта праграмнае палажэнне павінна напаўняцца ўсё больш глыбокім і канкрэтным зместам», — падкрэсліў таварыш М. С. Гарбачоў на Пленуме. Партыя і Савецкая дзяржава праяўляюць нястомныя клопаты аб павышэнні народнага дабрабыту. З году ў год растуць грашовыя даходы насельніцтва, павялічваюцца выплаты і льготы з грамадскіх фондаў спажывання, пашыраецца вытворчасць тавараў шырокага народнага ўжытку, у вялікіх маштабах вядзецца жыллёвае будаўніцтва. З 1986 года намечана павысіць зарплату медыцынскім работнікам. Але паляпшэнне ўмоў жыцця савецкіх людзей павінна засноўвацца на ўсе ўзрастаючым іх укладзе ў агульную справу.

На Пленуме гаварылася, што далейшае ўдасканальванне і развіццё дэмакратыі, усёй сістэмы сацыялістычнага самакіравання народа партыя разглядае як адну з канкрэтных задач сваёй унутранай палітыкі. Неабходны далейшае павышэнне ролі Саветаў народных дэпутатаў, актывізацыя прафсаюзаў, камсамола, народнага кантролю, працоўных калектываў. Паглыбленне сацыялістычнай дэмакратыі неразрыўна звязана з павышэннем грамадскай свядомасці савецкіх людзей. Павышэнне іх працоўнай і сацыяльнай актыўнасці, умацаванне дысцыпліны, выхаванне патрыятызму і інтэрнацыяналізму — важная задача праводзімай ідэалагічнай работы. Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў адзначыў, што «..будуць і надалей прымацца рашучыя меры па далейшаму навядзенню парадку, ачышчэнню нашага жыцця ад чужых з'яў, ад любых замахаў на інтарэсы грамадства і яго грамадзян, па ўмацаванню сацыялістычнай законнасці». Неабходна і далей пашыраць галоснасць у рабоце партыйных, савецкіх, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, што будзе садзейнічаць павышэнню актыўнасці савецкіх людзей.

Пленум падкрэсліў, што ў галіне знешняй палітыкі наш курс ясны і паслядоўны: гэта курс міру і прагрэсу. У барацьбе за мір, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс узаемадзейнічаюць тры рэвалюцыйныя сілы сучаснасці: сусветная сацыялістычная сістэма, нацыянальна-вызваленчы рух і міжнародны рабочы рух. Таварыш М. С. Гарбачоў адзначыў: «Першая запаведзь партыі і дзяржавы — берагчы і ўсямерна ўмацоўваць брацкую дружбу з нашымі бліжэйшымі саратнікамі і саюзнікамі — краінамі вялікай сацыялістычнай садружнасці... Мы хацелі б сур'ёзнага паляпшэння адносін з Кітайскай народнай рэспублікай і лічым, што пры наяўнасці ўзаемнасці гэта зусім магчыма».

Характарызуючы сучасную міжнародную абстаноўку, таварыш М. С. Гарбачоў сказаў, што «ніколі раней над чалавецтвам не навісла такая страшная пагроза, як у нашы дні. Адзіны разумны выхад з узнікшага становішча — гэта дагаворанасць процістаячых сіл аб неадкладным спыненні гонкі ўзбраенняў — перш за ўсё ядзерных — на зямлі і недапушчэнні яе ў космасе». Савецкі Саюз, краіны Варшаўскага дагавору не імкнуцца да дасягнення аднабаковых пераваг перад ЗША, перад краінамі НАТО, да ваеннай перавагі над імі. Але ў той жа час мы не дапусцім парушэння стратэгічнай раўнавагі ў ваеннай магутнасці СССР і ЗША, Варшаўскага дагавора і НАТО.

На нечарговым сакавіцкім Пленуме ЦК КПСС добра паказана неабходнасць далейшага ўмацавання партыі, павышэння яе арганізуючай і накіроўваючай ролі ва ўмовах ра-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

### ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу горача віншуюць асістэнта СТАРАВОЙТАВА Аляксандра Паўлавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

*На абласным злёце студэнцкіх атрадаў*

## СЕМЕСТР ПРАЦОЎНАГА ГАРТУ

У мінулую суботу ў Палацы культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна адбыўся XVI абласны злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў, які падвёў вынікі леташняга працоўнага семестра, абагуліў накоплены вопыт студэнцкага патрыятычнага руху.

Аб дзейнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў вобласці на злёце расказала сакратар абкома камсамола Н. А. Меланіч. Удзельнікі злёту абмяняліся вопытам сваёй работы. Сярод выступаўшых была студэнтка нашага універсітэта А. Барсукова.

Мінулагодні працоўны экзамен студэнты і навучэнцы Гомельшчыны вытрымалі на выдатна. У рэспубліканскім аглядзе Гомельскі абласны студэнцкі будаўнічы атрад па выніках летняга і асенняга працоўнага перыядаў выйшаў пераможцам. Яму прысуджаны пераходныя Чырвоныя сцягі Савета Міністраў і ЦК камсамола рэспублікі. Узнагароды на злёце ўручыў сакратар ЦК ЛКСМБ А. Хандогін.

Пяць вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў выйшлі пераможцамі ў абласным аглядзе. Сярод іх — зводны будаўнічы атрад ГДУ. Ён удастоены пераходнага вымпела абкома камсамола і грашовай прэміі.

Нашаму універсітэту ўручана таксама Грамата ЦК ЛКСМБ за якаснае фарміраванне атрадаў і паспяховае правядзенне працоўнага семестра-84.

Шэрагу студэнцкіх будаўнічых атрадаў за ўдарную працу ўручаны пераходныя Чырвоныя сцягі і вымпелы будаўніча-мантажных трэстаў і аб'яднанняў, упраўленняў і арганізацый. Атрад «Ударнік», які быў сфарміраваны з выкладчыкаў і супрацоўнікаў эканамічнага факультэта (камандзір **А. Іванюк**, камісар **М. Прахарэнка**), заваяваў пераходны Чырвоны сцяг трэста «Калінкавічыводбуд». Атрад «Волаты» фізічнага факультэта (камандзір **І. Новік**, камісар **А. Сяленя**) узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам упраўлення сельскай гаспадаркі аблвыканкома. Атраду «Мерыдыян» матэматычнага факультэта (камандзір **В. Некрашэвіч**, камісар **А. Жосткіна**) уручаны пераходны Чырвоны сцяг аб'яднання «Аблплодагародніна».

Удзельнікі студэнцкага злёту прынялі Зварот да ўсіх байцоў працоўнага семестра 1985 года, у якім заклікалі юнакоў і дзяўчат настойліва змагацца за выкананне задач, пастаўленых партыяй перад камсамолам, аддаць свае сілы, веды і энергію справе далейшага ўмацавання магутнасці нашай Радзімы.

На злёце быў дадзены канцэрт, у якім выступілі самадзейныя артысты ВНУ, у тым ліку і нашага універсітэта, тэхнікумаў і прафтэхвучылішчаў горада.

У рабоце абласнога злёту студэнцкіх будаўнічых атрадаў прынялі ўдзел сакратар абкома КПБ С. П. Бабыр, які выступіў з прамовай, загадчык аддзела будаўніцтва абкома КПБ В. М. Сыч, камандзір рэспубліканскага студэнцкага будаўнічага атрада ЦК ЛКСМБ І. І. Шостак.

Сярод прысутнічаючых кіраўнікоў навучальных устаноў быў рэктар нашага універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць.

*Размеркаванне маладых спецыялістаў*

## АТРЫМАЛІ НАКІРАВАННІ

Як ні стараліся яны стрымліваць сваё хваляванне перад дзвярыма рэктарата і ўжо непасрэдна перад самой размеркавальнай камісіяй, у іх гэта не атрымлівалася. Размеркаванне... Яно непазбежна ў студэнцкім жыцці. Толькі ў гэтыя мінуты чакання вырашэння свайго далейшага жыццёвага лёсу задумваюцца пяцікурснікі, як хутка ляцяць гады вучобы і як шкада з імі развітвацца. Але... Застаецца «узяць апошнія бар'еры» на шляху да дыплома, і бывай, універсітэт!

Сёлета Гомельскі дзяржаўны універсітэт дае пуцёўку ў самастойнае працоўнае жыццё 651 выпускніку. І ў гэтыя дні, як ніколі раней, вельмі часта звярталіся да геаграфічнай карты пяцікурснікі. «Дзе ён той горад ці гарадскі пасёлак, які чакае іх на працу?»

Як правіла, лепшыя месцы дасталіся выдатнікам вучобы, камсамольскім і грамадскім актывістам. Выпускнік гісторыка-філалагічнага факультэта, ленінскі стыпендыят Іван Афанасьеў застаецца працаваць ва універсітэце. Алена Шамяткова, якая з'яўлялася членам камсамольскага бюро гістфіла, атрымала накіраванне ў Мазырскі педінстытут. Студэнты групы Г-51, якая прызнана лепшай у рэспубліцы, будуць выкладаць гісторыю ў школах г. Гомеля, Мазыра, Жлобінскага раёна, Лоеўскім педвучылішчы.

Як заўсёды шырокая геаграфія месц размеркавання ў геолагаў. Акрамя геалагічных партый нашай рэспублікі, пяцікурснікі геафака раз'едуцца ў розныя куткі нашай Радзімы — у гарады Ташкент, Хабараўск, Улан-Удэ, Архангельск і інш.

Настаўніцкія калектывы вобласці папоўняць выпускнікі фізічнага, матэматычнага і біялагічнага факультэтаў.

(Наш кар.)



Выдатна вучылася, была камсамольскай актывісткай пяцікурсніца гісторыка-філалагічнага факультэта Ларыса Кавалевіч. Ва універсітэце яна набыла спецыяльнасць выкладчыцы беларускай і рускай моў і літаратур і будзе працаваць у адной з сярэдніх школ Гомельскага раёна.

НА ЗДЫМКУ: Л. Кавалевіч у час размеркавання.

Фота В. Васільчанкі.



